# ВЫХАВАННЕ (ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАЕ) АСОБЫ ВУЧНЯ СРОДКАМІ РОДНАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

**Карчагіна В.М.,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава)

*Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе,*
*Хто забыў саю мову – усё згубіў.*
*У. Караткевіч*

“Жыве мова – жыве народ”, - сцвярджаў Я.Ф. Карскі. Некаторыя ж лічаць, што, для того каб быць беларусам, зусім не абавязкова ведаць беларускую мову. Гэтай памылковай думкі прытрымліваюцца, на жаль, многія. І ідзе яна ад неразумення сутнасці мовы, яе месца ў нацыянальнай культуры. Мову разглядаюць проста як сродак камунікацыі, сродак зносін. І калі зводзіць мову толькі да гэтай адной функцыі, то тады, безумоўна, усё роўна, на якой мове чалавек гаворыць: рускай, нямецкай, французскай, англійскай ці нават штучнай – эсперанта. На самай жа справе мова – гэта канцэнтрыраванае адлюстраванне, выражэнне нацыянальнай культуры. “ Мова народа, - сцвярджаў В. Гумбальд, - ёсць яго дух, і дух народа ёсць яго мова”. Без нацыянальнай мовы няма і не можа быць нацыянальнай культуры,без нацыянальнай культуры – нацыі. Гаворка ідзе, такім чынам, не пра прыватнае, хаця і важнае пытанне – захаванне беларускай мовы. Гаворка ідзе пра лёс беларускай нацыі. Добра разумеючы гэта, ад бязроднага нігілізму перасцерагаў Ф.Багушэвіч: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не умёрлі!”.

Справа ў тым, што родная мова – не толькі сродак узаемін паміж людзьмі. Гэта “адзежа душы народа” (Ф. Багушэвіч), сфера тонкіх адчуванняў душы, бурлівых эмоцый і голас спрадвечнага духу. Яна жывая, гэтая сфера, пакуль жывая родная мова. Яна аснова . Родная мова і ўнутраны свет чалавека ўзаемазалежныя. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, “адной думкай жыць, адной долі шукаць”.

З’яўляючыся фундаментам духоўнай культуры, этнічнай прыметай нацыі, мова лічыцца адным з галоўных сродкаў ідэнтыфікацыі асобы чалавека, выхавання нацыянальнай самасвядомасці, далучэння да сусветнай культуры. Менавіта таму гэты важны сацыяльны аспект пакладзены ў цэнтр Закона “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь”:”Мова – не толькі сродак зносін, а і душа народа, аснова і важнейшая частка яго культуры”.

Моўнае развіццё асобы непасрэдна звязана з развіццём мыслення, фарміраваннем духоўнага вобліку, што вызначаецца роляй мовы ў жыцці грамадства. Выдатны вучоны XIX стагоддзя Ф.І. Буслаеў пісаў : “Родная мова так зраслася з асобай кожнага, што вучыць мове – значыць разам і развіваць духоўныя здольнасці вучняў”. Ролю роднай мовы ў адукацыі і выхаванні адзначалі лепшыя прадстаўнікі педагагічнай навукі як мінулага, так і нашага часу. Неаднойчы падкрэсліваў адукацыйнае і выхаваўчае значэнне роднай мовы Я. Колас. Роднае слова ён лічыў той крыніцай, з якой пазнаюцца жыццё, навакольны свет, бо гэта крыніца адукацыі, чалавечага розуму і, што вельмі важна, пачуццяў. Чужую мову можна вывучыць і нават думаць на ёй, а вось адчуваць – толькі на роднай.

Добрае веданне роднай мовы і валоданне ёю дапамагае вучням паспяхова набываць веды па ўсіх школьных прадметах. І ад таго, як вучні авалодаюць мовай, залежаць іх поспехі ў вучобе па іншых прадметах.

Як вядома, на ўроках беларускай мовы ставяцца асноўныя мэты: адукацыйная, практычная, развіццёвая і выхавальная. Адукацыйная мэта, безумоўна, звязана з фарміраваннем ведаў пра сістэму мовы, практычная - з фарміраваннем уменняў і



Рэпазіторый ВДУ

навыкаў. Развіццёвая – прадугледжвае найперш развіццё навыкаў маўленча-камунікатыўнай дзейнасці, інтэлектуальных здольнасцей, уяўленняў і памяці вучняў. Выхавальная мэта звязана на ўроках мовы ў першую чаргу з выхаваннем культуры мовы і эстэтычнага густу.

Мова – гэта яшчэ і канал псіхічнага, інтэлектуальнага развіцця чалавека. Вядома, як цесна звязаны мова і мысленне (мова – сродак выражэння думкі, форма існавання мыслення). Значыць, развіваючы мову дзяцей (узбагачаючы яе разнастайнымі лексічнымі сродкамі, граматычнымі формамі і канструкцыямі, фарміруючы ўменне правільна будаваць звязнае выказванне), мы развіваем і разумовыя (інтэлектульныя) здольнасці.

Безумоўна, працэсы навучання і выхавання ў школе ўзаемазвязаныя. І ўрокі роднай мовы ў сувязі з гэтым набываюць асаблівае значэнне. "Настаўнік павінен выхоўваць павагу да роднай мовы, падтрымліваць і развіваць у дзяцей цікавасць да яе, адкрываць ім сілу і прыгажосць роднага слова," – сцвярджаў Л.П. Падгайскі.

Задача настаўніка роднай мовы і літаратуры не павінна зводзіцца толькі да прывіцця пэўных мовазнаўчых ведаў, уменняў, навыкаў. Яна значна шырэйшая - навучыць размаўляць на роднай мове.

Сучасная канцэпцыя выкладання беларускай мовы вызначае камунікатыўна-дзейнасны падыход, калі мова асвойваецца, у першую чаргу, як сродак пазнання, камунікацыі, далучэння да культуры. На ўроках славеснасці злучаюцца ў адно цэлае лінгвістычны і мастацкі матэрыял, моўны і зместавы бакі твора.

З аднаго боку, такія ўрокі садзейнічаюць асэнсаванню мовы не як уніфікаванай сістэмы арфаграфічных і пунктуацыйных правіл, пазбаўленай жыцця, руху, а як гісторыі духоўнага жыцця народа. З другога боку, дакрануўшыся да слоўнай тканіны мастацкага твора, вучні спасцігаюць яго змест, аўтарскую задуму праз фанетычныя, лексічныя і граматычныя асаблівасці мовы.

Зараз вучонымі ўсё часцей ставіцца пытанне пра тое, каб майстэрства пісьменніка вывучалася на сумежжы моваранаўства і літаратуразнаўства, таму настаўніку-славесніку нельга рэзка розніць урокі мовы і літаратуры, бо як на адным, так і на другім павінна адбывацца сапраўднае спасціжэнне ведаў пра слова.

Ва ўмовах руска-беларускага білінгвізму пашыраецца ўзаемаўплыў роднасных моў і ў значнай ступені ад майстэрства настаўніка залежыць культура мовы маладога пакалення, мовы як беларускай, так і рускай. Выкладчыкі мовы павінны добра ведаць абедзве мовы незалежна ад таго, якую з іх выкладаюць у школе. Супастаўленне фактаў адной мовы з фактамі другой не можа быць штучным, абмяжоўвацца толькі правіламі арфаграфіі, пунктуацыі, граматыкі. Значную ўвагу трэба надаваць пытанням фарміравання стылю выказвання як на беларускай, так і на рускай мове, выпрацоўцы навыкаў правільнага перакладу з адной мовы на другую.

Для Беларусі, дзе больш чым палова насельніцтва ў сваей моўнай практыцы карыстаецца дзвюма мовамі - мовай сваей нацыянальнасці і рускай мовай, праблема двухмоўя належыць да ліку найбольш актуальных. Дэмакратычны характер нашага грамадства забяспечвае ўсе магчымасці для развіцця мовы, выключаючы жорсткую рэгламентацыю ў выкарыстанні той ці іншай мовы.У РБ забяспечана канстытуцыйнае права на поўнае ўжыванне роднай мовы ва ўсіх сферах жыцця.У нашай краіне адносіны да рускай мовы як да другой роднай мовы маюць глыбокія гістарычныя карані ў агульным паходжанні беларускай і рускай моў.

Блізкароднасны характар беларуска-рускага двухмоўя, з аднаго боку, спрыяе яго пашырэнню, садзейнічае вывучэнню рускай мовы практычна ўсімі ў даволі высокай ступені, а з другога, – ставіць пэўныя праблемы. Наша грамадства імкнецца да сіметрычнага двухмоўя, гэта значыць,такога, пры якім кожны мог бы без цяжкасцей і памылак ужываць пры неабходнасці адну або другую мову.



Репозиторий ВГУ

Трэба ўсімі магчымымі, зразумела, законнымі спосабамі дабівацца ажыццяўлення Закона аб мовах, каб родная мова заняла сапраўды дзяржаўнае становішча, бо ў Рэспубліцы Беларусь поўнакаштоўны працэс духоўнага авалодання мовай гарантуе толькі родная мова.

Бацькава,спрадвечная,святая,Богам дадзеная, "адзежда душы чалавека"-так вобразна, афарыстычна выявіў Ф.Багушэвіч сваё разуменне ролі і сілы роднага слова ў "Прадмове" да зборніка "Дудка беларуская". І па сённяшні дзень гэты твор - пераканаўчы прыклад уздзеяння на розум і пачуцці тых,хто хочуць "людзьмі звацца".Пераканаўча і доказна паэт даводзіць нам,што любоў да мовы ёсць адно з праяўленняў патрыятызму.І эпітэты "святая,Богам дадзеная" –не проста мастацкі прыём,а напамін усім нам:святое-гэта тое,што мы не выбіраем (у сваім выбары мы можам і памыліцца ),а што даецца нам ад нараджэння - нашы бацькі,радзіма - ці нараджаецца намі – дзеці.І мова – як "святыня народа,бяссмерце яго".Здрада святому – недаравальны грэх.

Усведамленне таго, што любоў да роднай мовы ёсць адно з праяўленняў любові да Радзімы, вызначала ўсю патрыятычную дзейнасць настаўнікаў-моваведаў падчас працы ў Віцебскім кадэцкім вучылішчы.

Спачатку было слова. Дакладней, словы беларускага паэта Сяргея Грахоўскага: " Чый лік ты на зямлі памножыш- гаспадароў або гасцей".

Мы сумесна з вучнямі задумаліся і вырашылі знайсці адказ на гэта пытанне,прааналізаваўшы падручнікі па літаратуры і мове, правёўшы анкетаванне ў класе: " Хто з'яўляецца гаспадаром зямлі, добрым грамадзянінам?"

Знайшлі адказы ў рымскага паэта Гарацыя, савецкага педагога Васіля Сухамлінскага, беларускага паэта Пімена Панчанкі.

Рымскі паэт Гарацый лічыў гаспадаром зямлі, добрым грамадзянінам "таго, хто выконвае парады бацькоў, правы і законы".

Васіль Сухамлінскі, савецкі педагог, пісаў так: "Настоящий патриот… не только рассуждает, но и на деле проявляет свою ответственность за каждый клочок земли, за её богатства, за реки и озёра, за воздух, которым дышим".

А беларускі паэт Пімен Панчанка раіць нам:

Каб стаць чалавекам
У час наш суровы,
Помні жыцця асновы:
Гавары, як вучыла маці,
Рабі, як вучыў бацька,
Усё, на што здольны,
Зрабі для Радзімы.

Карыстаючыся гэтымі парадамі, мы прааналізавалі змястоўны матэрыял па мове і літаратуры падручнікаў 9 класа з пазіцыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання асобы кадэта.

Любая літаратура – з'ява нацыянальная. Так, беларускія пісьменнікі выяўлялі і выяўляюць думкі, пачуцці, псіхалогію беларусаў і робяць гэта вобразнымі сродкамі беларускай мовы. Мова – матэрыял і інструмент кожнага пісьменніка. Мова – найбольш важная нацыяналная прыкмета літаратуры.

У 9 класе мы пачалі вывучаць літаратуру з яе самай старажытнай формы – ананімнай, вуснай, г.зн. міфалогіі, фальклору. Пазнаёміліся з асноўнымі дасягненнямі прыгожага пісьменства антычнасці (IX ст. да н.э. – V ст. н.э.).

Затым знаёмства з Бібліяй, найвялікшым здабыткам культуры чалавецтва; з некаторымі літаратурнымі творамі перыяду ўваходжанне сучасных беларускіх зямель у Старажытную (Кіеўскую) Русь ("Жыццё Еўфрасінні Полацкай",словы, казанні і павучанні Кірылы Тураўскага).



Репозиторий ВГУ

Эпоху Сярэднявечча (V-XIVстст.) зменіць эпоха Адраджэння (Рэнесансу) (XIV-першая палова XVIII ст.).

Мы пазнаёміліся з творчасцю Францыска Скарыны і Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага.

Беларуская літаратура Новага часу , што пачалася напрыканцы XVIII–пачатку XIX ст. і працягваецца па сённяшні дзень .Мы яе вывучалі пачынаючы з паэм "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе".Знаёміліся з творчасцю беларуска-польскіх аўтараў Яна Чачота, Уладзіслава Сыракомлі, Яна Баршчэўскага,беларускіх пісьменнікаў Вінцэнта Дуніна-Марцікевіча, Кастуся Каліноўскага, Янкі Лучыны,Францішка Багушэвіча.

У XX стагоддзі беларуская літаратура дасягнула асаблівага росквіту. Мы вывучаем творчасць такіх яе вяршынных постацей, як Янка Купала, Якуб Колас, Цётка (Алаіза Пашкевіч), Максім Багдановіч, Алесь Гарун. Гэта наша спадчына, што робіць беларуса беларусам.

| № | Накірунак выхавання | Колькасць праактыкаванняў | % |
|---|---|---|---|
| 1. | Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне | 13 практ. | 28% |
| 2. | Ідэалагічнае выхаванне | 4 практ. | 8,5% |
| 3. | Маральнае выхаванне | 5 практ. | 10,6% |
| 4. | Эстэтычнае выхаванне | 6 практ. | 12,8% |
| 5. | Культура самапазнання, самарэгуляцыі асобы | 7 практ. | 14,9% |
| 6. | Культура здаровага вобразу жыцця | 2 практ. | 4,25% |
| 7. | Працоўнае і прафесійнае выхаванне | 4 практ. | 8,5% |
| 8. | Экалагічнае выхаванне | 3 практ. | 6,4% |
| 9. | Культура быту і адпачынку | 3 практ. | 6,4% |

Гэта асноўныя гістарычныя эпохі, праз якія прайшлі як беларуская, так і руская, і большасць еўрапейскіх літаратур. А мы ведаем: гісторыя вучыць нас, як жыць сёння.

Безумоўна, у гэтым наша шчасце і паратунак, што ў нас заўсёды былі людзі-маякі, людзі-светачы, людзі-волаты, на чые дзяржаўную і чалавечую мудрасць, талент можна арыентавацца і абаперціся.

Знаёмства з лепшымі творамі айчынных пісьменнікаў у іх храналагічнай паслядоўнасці дапаможа нам сфарміраваць належныя эстэтычныя і грамадскія ідэалы, стаць сапраўднымі грамадзянамі, патрыётамі сваёй Бацькаўшчыны – суверэннай, незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Вучні 9 класа кадэцкага вучылішча ажыццяўлялі навуковае даследаванне пад кіраўніцтвам настаўніка беларускай мовы і літаратуры В.М.Карчагінай. У гэтым ім актыўна дапамагалі намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце В.В.Малах і псіхолаг Ю.М.Картаўнёва. У падручніку па беларускай мове 9 класа 234 практыкаванні, мы склалі табліцу, якая адлюстроўвае рознабаковы выхаваўчы змест вучэбнага матэрыялу. Як бачна, у падручніку прадстаўлены матэрыял, які садзейнічае развіццю асобы кадэта. Ёсць матэрыял, арыентаваны на ўсе накірункі выхавання. Перавага аддаецца грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню.

Такім чынам, у рашэнні тых задач, якія сёння стаяць перад школай, важнае месца належыць роднай літаратуры і мове як вучэбным прадметам. Змест праграмных твораў можа забяспечыць паспяховае дасягненне адной з важнейшых мэт адукацыі, вызначанай законам "Аб адукацыі" ў Рэспубліцы Беларусь, − спрыянню гарманічнаму развіццю асобы, поўнай рэалізацыі яе творчых здольнасцей. Вывучэнне мовы і літаратуры і выхаванне мовай і літаратурай – з'явы ўзаемазвязаныя і ўзаемазалежныя.

Рэпазіторый ВДУ

Усё залежыць ад чалавека, яго вытокаў, ад маральнага падмурка, на якім грунтуецца ўсё чалавечнае і чалавечае. З нічога нішто і будзе. Радзіма– гэта святыня, дадзеная нам Богам, бо яна засталася “ад прадзедаў спакон вякоў”, яе любяць, як бацькоў.А бацькоў не выбіраюць і не мяняюць.

Што ж у будучым чакае Беларусь і беларуса?

А гэта ўжо ў значнай ступені ў нашых руках і залежыть ад нашых адносін да нашага абавязку перад роднай краінай. Калі мы зможам выканаць наш абавязак добрасумленна, то будучыня наша светлая і радасная.

На нас, грамадзянах Рэспублікі Беларусь, вялікая адказнасць. На нас не павінна скончыцца беларускасць, беларуская дзяржава.

Кажуць, што чалавек у жыцці становіцца такім, якім выйшаў з дзяцінства. Наша дзяцінства, сагрэтае клопатам дзяржавы, садзейнічае выхаванню свабоды духу, уздымае нацыянальную самасвядомасць. Нам, грамадзянам Рэспублікі Беларусь, нельга перарываць кола гістарычнага развіцця.

І мы ўпэўнены: гісторыя нашай краіны, жыццё нашых бацькоў, набытыя веды не дазволяць нам сысці са шляху чалавека-грамадзяніна, чалавека-патрыёта. Мы хочам быць шчаслівымі, атрымаць прафесію, якая нам падабаецца, хочам справамі быць карыснымі свайму народу, Айчыне.І гэта не гучныя словы. Мы вучымся.І таму штодзённая работа с кнігай –крок ў дарослае жыццё. Трэба чытаць многа і настойліва,каб набыць веды. А веды – верны дарадчык.Мікола Мятліцкі, беларускі паэт, раіць нам:

Думайце, дзеці Зямлі:
Возьмеце Заўтра ў рукі.
Свет наш трывог і бедаў.
Ад якасці вашай навукі,
Ад сутнасці вашай і ведаў
Залежыць гісторыі крок

Спіс цытаваных крыніц:


1. Беларуская літаратура: вучэб. дапаможнік для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / пад рэд. В.П.Рагойшы. - Мінск: Нац. ін-т адукацыі , 2011. - 320с.
2. Беларуская мова : вучэб. дапаможнік для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / пад рэд. Н.М. Гардзей. - Мінск: Нац. ін-т адукацыі , 2011. - 264 с.
3. Шамякіна , Т.І. Беларуская літаратура ў 9 класе: вучэб.-метад. дапаможнік для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Т.І. Шамякіна. - Мінск: Нац. ін-т адукацыі , 2012. - 208 с.


## ТЕХНОЛОГИЯ МОДЕРАЦИИ КАК ЭФФЕКТИВНОЕ СРЕДСТВО ОБУЧЕНИЯ


**Крицкая Н.В.,** кандидат филологических наук, доцент
**Ковалевская Т.А.,** старший преподаватель
(г. Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова)


Каждый ребенок талантлив и талантлив по-своему. Учитель должен найти подход к каждому. Формирование творчески одарённой личности приобретает сегодня не только теоретический, но практический смысл. Жизнь становится разнообразнее и сложнее, она, чем дальше, тем больше требует подвижности мышления, быстрой ориентировки, творческого подхода к решению различных задач. Поэтому перед школой,



Репозиторий ВГУ